

ВЫНІШЧЫЦЕ СУМНІК СА СВАЙГО КВЕТНІКА! 7

КНІГА З ГАЛАСАМІ І ЎСПАМІНАМІ 9




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 КАСТРЫЧНІКА 2023 г. АЎТОРАК № 191 (30071)


## КОРАТКА

- Беларускім бязвізам з пачатку года скарысталіся больш як 340 тысяч іншаземцаў.
- Беларусь павысіла экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты.
- «Мінсктранс» падрыхтаваў амаль 70 працэнтаў пасажырскага транспарту і 50 працэнтаў тэхнікі да работы зімой.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй РАМАШКА, намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

*«У кацельнях арганізацый ЖКГ на сёння выкарыстоўваецца розныя віды паліва — газ, мясцовыя віды паліва ў выглядзе дроў, пелет, шчапы, нямногія яшчэ выкарыстоўваюць мазут. У адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай адбываецца пастаянная мадэрнізацыя гэтых кацельняў і перавод іх з неэфектыўных відаў паліва на мясцовыя. Што датычыцца драўнянага паліва, то на сёння ў Беларусі для гэтых мэт нарыхтавана больш як 2 млн куб. м дроў. Гэта на 28 % больш за план. Шчапа нарыхтавана ў аб'ёме 620 тыс. куб. м, што на 13 працэнтаў больш за заданне. Запасаў паліва больш чым дастаткова. Яны дазволяць працягваць працу гэтых аб'ектаў без дэфіцыту і неабходнасці прыняцця дадатковых рашэнняў. Ніхто не можа прадбачыць, наколькі суровай ці мяккай будзе зіма, таму заўсёды ў нас запас робіцца з пэўным запасам».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ЛЮДЗІ ХОЧУЦЬ БАЧЫЦЬ УЛАДУ»

### Прэзідэнт прыняў з дакладам Старшыню Савета Рэспублікі Наталлю Качанаву

**Новы працоўны тыдзень Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пачаў з даклада Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай. За дзясятую сесію Саветам Рэспублікі разгледжаны і адобраны 101 законапраект, у тым ліку прыняты два законы — «Аб Усебеларускім народным сходзе» і «Аб асновах грамадзянскай супольнасці». У цэлым прынятыя законы забяспечваюць дзейнае прававое рэгуляванне запатрабаваных беларускім грамадствам і часам пытанняў, адказваюць сучасным выклікам і накіраваныя на перспектыву.**

СТАР. 2





Фота БелТА.

Дзяржаўны інтарэс

# УСВЯДОМЛЕНЫ ВЫБАР

### Ці модна сёння «купляць беларускае»?

**Падводзячы вынікі работы эканомікі нашай краіны ў студзені — жніўні бягучага года, Міністэрства эканомікі канстатавала: спажывецкая актыўнасць беларусаў узрасла. У прыватнасці, значна прыбавіў па выніках 8 месяцаў рознічны тавараабарот. І калі разважаць пра тавары лёгкай прамысловасці, ці можна сцвярджаць, што апошнім часам айчынны спажывец стаў часцей «купляць беларускае»? Ці здольныя ў вачах пакупнікоў айчынныя адзенне, абутак і аксесуары канкурыраваць з замежным масмаркетам? Як спажыўцы ацэньваюць рэчы айчынных марак і да якіх з вытворцаў часцей звяртаюцца? І што намечана зрабіць у найбліжэйшы час, каб узрослы сёння імпульс выбіраць сваё ў беларускага спажыўца не згас? Аб гэтым мы гутарым з намеснікам старшыні канцэрна «Беллегпрам» Наталляй МУРАШКА.**

СТАР. 5



Сучасніцы

# КАЛІ ЛЮБІШ СВАЮ СПРАВУ



### Як быць кіраўніком вялікай арганізацыі і маці пяцярых дзяцей

**За гады работы не раз даводзілася сустракацца з жанчынамі, якія прысвяцілі сябе сям'і. Выгадаваць пяцёра дзяцей — гэта вам не жартачкі, а сапраўдная праца маці-гераіні. І тут ужо ніякай іншай работы можа і не быць, бо, як сказаў адзін мудры святар, ахвяраваць сябе на служэнне сям'і — само па сабе азначае духоўны подзвіг. Ёсць у маіх журналісцкіх архівах-блакнотах таксама гераіні-працаўніцы, якія аддалі перавагу кар'еры, прафесійнаму росту. А вось каб два ў адным: і вялікая дружная сям'я, і паспяховая работа — вялікая рэдкасць.**

СТАР. 8

ISSN 1990 — 763X